Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

**22 студзеня 2025 г.**

# У АДКАЗЕ ЗА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ

**Пачалося датэрміновае галасаванне на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на некалькіх выбарчых участках і высветлілі, наколькі грамадзяне актыўныя ў першы дзень датэрміновага галасавання. Дарэчы, участкі для галасавання адкрыты з 12.00 да 19.00 без перапынку на абед. У асноўны дзень выбараў — 26 студзеня — можна будзе прагаласаваць з 8.00 да 20.00.**




На выбарчым участку № 16, які размешчаны ў сталіцы на базе Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, сярод выбаршчыкаў пераважае моладзь. Многія галасуюць упершыню. Па інфармацыі Цэнтральнай выбарчай камісіі, першы раз у галасаванні прыме ўдзел больш як 88 тысяч выбаршчыкаў. Для гэтай катэгорыі грамадзян Цэнтрвыбаркам традыцыйна падрыхтаваў падарункі — кнігу «Сімвалы суверэннай Беларусі» і футболку з надпісам «Мой голас ПЕРШЫ!».




Як прызнаюцца маладыя выбаршчыкі, гэтая падзея запомніцца ім на ўсё жыццё. Студэнт 2 курса Арцём Гардзіевіч вырашыў прагаласаваць датэрмінова, каб у выхадныя дні паехаць дахаты. Малады чалавек прызнаецца: падчас ажыццяўлення свайго грамадзянскага абавязку адчувае найвялікшую адказнасць. «Усё залежыць ад кожнага чалавека: мой голас — пэўны ўнёсак у лёс краіны, — кажа Арцём. — Усе павінны скарыстацца сваім правам галасавання. Мы павінны ведаць, што больш за ўсё хвалюе народ».

Для другакурсніка ўніверсітэта Максіма Есіповіча гэта таксама першыя выбары. «Вельмі хвалююча рабіць такі важны выбар першы раз, — прызнаецца ён. — Мы ўсе адказныя за будучыню сваёй краіны, адпаведна, лічу, што важны голас кожнага». Па яго словах, вельмі зручна, што прадугледжана датэрміновае галасаванне. «Можна пазбегнуць вялікай чаргі ў асноўны дзень галасавання і планаваць свой дзень», — патлумачыў малады чалавек.



Як і ўсе выбаршчыкі, хто галасуе ўпершыню, Арцём і Максім атрымалі ад членаў выбарчага ўчастка футболку з надпісам «Мой голас ПЕРШЫ!» і падарункавае

выданне «Сімвалы суверэннай Беларусі». Футболкі ўжо паспяшаліся памераць. Кнігу, вядома, пагарталі. Асабліва спадабалася выкарыстанне QR-кодаў, дзякуючы якім можна больш падрабязна азнаёміцца з сімваламі Беларусі: напрыклад, адправіцца на экскурсію па Мірскім замку.




На выбарчым участку — не толькі студэнты. Тут галасуюць і жыхары найбліжэйшых дамоў. Аляксей Біткоў, напрыклад, вырашыў не адкладваць галасаванне на апошні дзень, а таму разам з двухгадовай дачушкай прыйшоў на выбарчы ўчастак падчас прагулкі. Маленькай Вікторыі, мяркуючы па ўсім, галасаваць разам з бацькам спадабалася — праз некалькі гадоў і яна будзе рабіць свой самы першы важны выбар.



За працэсам сочаць нацыянальныя назіральнікі. Адзначаюць, што з першых хвілін адкрыцця выбарчага ўчастка маладыя людзі актыўна прымаюць удзел у галасаванні. «Хтосьці ў нядзелю будзе не ў Мінску, у кагосьці — праца, іншыя справы, — тлумачыць нацыянальны назіральнік. — Усё праходзіць у адпаведнасці з заканадаўствам, у спакойнай і нават святочнай абстаноўцы».

Сакратар участковай камісіі № 16 Алена Андрэеўна ўдакладніла, што з самага пачатку электаральнай кампаніі маладыя людзі звярталіся ў камісію з пытаннямі. «Адкрытыя дыялогі, якія праводзіліся на базе нашага ўніверсітэта, далі магчымасць зрабіць маладым людзям правільны выбар», — падкрэсліла яна. Плануецца, што на дадзеным участку ўпершыню ў галасаванні прыме ўдзел больш як 250 студэнтаў.




З пытаннямі ў камісію звяртаецца не толькі моладзь. Тэлефануюць прадстаўнікі розных узроставых катэгорый, задаюць пытанні, якія іх цікавяць. У прыватнасці, па пэўных прычынах (у асноўным з-за праблем са здароўем) просяць наведаць па месцы жыхарства ў асноўны дзень галасавання для таго, каб і ў іх была магчымасць выканаць свой канстытуцыйны абавязак.




**Вераніка Канюта. Фото Віктара Іванчыкава**